Выстава

# ЗАГАДКІ ІЕРОГЛІФАЎ

## разгадвае ў Кітаі беларуская фотамастачка Лола Підлуская

Цяпер дзяўчына, якая ў 2001 годзе пераехала ў Кітай разам з мужам, прапануе жыхарам Беларусі сваё бачанне вобразаў Паднябеснай — у фотаработах. Яе выстава працуе ў Мабільнай галерэі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Усе працы былі дасланыя знарок для выставы з Кітая.

Які той свет, што знаходзіцца далёка ад нас? Пра кітайскі цуд — і культурны, і эканамічны — можна казаць колькі заўгодна, але пакуль на свае вочы на пабачыў тое, чым жыве гэтая краіна, наўрад ці можаш уявіць, якая яна. Лола Підлуская шмат ездзіла па розных гарадах і правінцыях Кітая. І свае ўражанні фіксавала фотакамерай. Дзесьці затрымлівалася даўжэй: у Шанхаі, напрыклад, пражыла пяць гадоў. І яшчэ пяць — на востраве Хайнань. Падарожжы па востраве сталі для яе больш чым захапленнем — з'явілася вялікая колькасць фотаздымкаў, якія прынеслі асалоду не толькі самой Лоле, але і былі адзначаныя іншымі. У выніку з дапамогай фотаработ былой мінчанкі быў створаны першы дапаможнік для падарожнікаў, якія чытаюць па-руску: «Хайнань. Ваш гід па востраве». Прычым аўтарка фота абнаўляе і выпускае яго штогод. Ёй належыць нават здымак галоўнай перліны вострава — залатой статуі бадхісатвы Гуаньінь. Ён адзін з найкаштоўнейшых у калекцыі мастачкі, бо з 2010 гэтаю статую забаранілі фатаграфаваць наогул.

Любоў для фатаграфіі, якая ўзнікла ў Лолы менавіта ў Беларусі, дзякуючы тату і дзядулю, у Кітаі стала для яе прафесіяй. Яна робіць пейзажныя здымкі, архітэктурныя, партрэты і анімалістыку. На фотасесіі да беларускі прыязджаюць з розных гарадоў Кітая. І некаторыя са здымкаў упрыгожваюць вокладкі часопісаў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Імпрэза

# Народжаны радавац

Вы яшчэ не хадзілі на Дзень нараджэння да спевака Зміцера Вайцюшкевіча? Толькі не трэба гэтага: «Асабіста не знаёмыя...» Хто такі — ведаем? Песні чулі — пра поры года, пра каханне, пра краіны розныя ды анёлкаў чароўных? Вось гэта той самы спявак і ёсць. А хто яшчэ не ведае, то самы час знаёміцца менавіта ў яго дзень нараджэння, 20 ліпеня.



Вайцюшкевіч тады асабліва добры — ён у сваё свята дорыць падарункі іншым у выглядзе ўласнага сольнага канцэрта. І так ужо не першы год. Сёлета ў малой зале канцэртнай залы «Мінск» таксама будуць святкаваць Дзень народзінаў Вайцюшкевіча, і гэта добрая нагода паслухаць лепшыя песні і даведацца, што новага ён спявае цяпер. Гэта яшчэ магчымасць пазнаёміцца з яго сябрамі — таксама музыкамі. Яны не проста прыйдуць, але таксама будуць спяваць. Для асабістых віншаванняў можна прынесці якія-небудзь летнія кветкі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Наш культурны асяродак

Жырандоля

Выпуск № 17 (103)

# ГАЛЕРЭЯ З БЕЛАРУСКІМ ТВАРАМ

## З'явілася ў Галандыі дзякуючы мастачцы Вікторыі Каваленчыкавай



Вікторыя і англійскі прынц.

**Не, натуральна, паездкі маладой дзяўчыны ў Галандыю з выставамі проста так скончыцца не маглі, падумалася мне спачатку. Прыгожая ды разумная, таленавітая ды працавітая... Каму такія не патрэбныя? Аказалася, сапраўды, прынца яна знайшла сабе галандскага... у Беларусі. Тут у мужа Вікторыі бізнэс. І так сталася, што ён цяпер у Беларусі бывае нават часцей за Вікторыю. А жонка тым часам свой бізнэс наладзіла, наадварот, у Галандыі — заснавала галерэю, дзе прадстаўляе не толькі свае ўласныя творы, але і іншых мастакоў і скульптараў з Беларусі. І аказалася, што гэта паспяхова: нас і наша мастацтва галандцы хочуць бачыць. Бо разумеюць, што такое ўзровень і якасць. А ці можам гэтым пахваліцца мы, жыхары сінявокай, якая нараджае таленавітых асобаў? Але мы самі гэтага часам не ўсведамляем і не надта добра ведаем творчасць нашых мастакоў. Чаму? Пра гэта я хацела паразважаць у гутарцы з Вікторыяй Каваленчыкавай.**

— Так было прадвызначана лёсам, што мне трэба было змяніць месца жыхарства. Але разам з асабістым лёсам трэба было вырашаць і творчы. Я разумела, што ў Беларусі ў маладых мастакоў перспектыў не вельмі шмат. Школа і платформа ў нас вельмі добрая, а вось магчымасцяў развівацца не вельмі...

***— Шчыра кажучы, наогул складана ўявіць у Беларусі галерэю, якая б працавала толькі на нашых маладых мастакоў. Як у вас гэта атрымалася, ды яшчэ і за мяжой?***

— У красавіку 2008 года я пераехала жыць у Галандыю, і адразу вырашыла, што хачу сябе праяўляць як мастак. У Беларусі нягледзячы ні на што ў мяне былі выставы ў Музеі сучаснага мастацтва, у Нацыянальным музеі, у Гётэ-інстытуце, МЗС, персанальная была ў музеі Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве. Я яшчэ студэнткай была, калі пачала выстаўляцца. Потым сама выкладала ў педагагічным інстытуце. Таму былі пэўныя амбіцыі чалавека, які ўжо склаўся. І для мяне па прыездзе ў Галандыю было абсалютна нязвыкла: як гэта яшчэ ніхто не ведае, хто такая Вікторыя Каваленчыкава?!. Непарадак!..

Мне трэба было, па-першае, знайсці месца працы, а па-другое, галерэю, якая б мяне выстаўляла. Насамрэч я была ўжо настолькі самадастатковым чалавекам, са сваім уяўленнем, бачаннем таго, як я хачу, што наўрад ці нейкая галерэя ўсе мае патрабаванні цалкам бы задаволіла. У мяне з'явілася ідэя адкрыць сваю галерэю. І я адкрыла: спачатку галерэю-студыю, дзе збіралася паказваць свае працы як аўтара.

Знайшла месца ў цэнтры Амстэрдама. Знарок выбірала, каб была людная вуліца, дзе вядомы рынак у гэтым раёне, моладзі шмат жыве, шмат кавярняў навокал. Каб людзям было прасцей заўважыць галерэю — само месца працуе як лепшая рэклама, без дадатковых намаганняў. Так і атрымалася. Калі я ўдзельнічаю ў буйных ЭКСПА-выставах, то да мяне падыходзяць і кажуць: «Так, ведаем, праязджалі гэтае скрыжаванне». Паўтара года ўсяго прайшло... У Галандыі, калі сябе прафесійна і мэтанакіравана праяўляць, то незаўважаным ты дакладна не застанешся. Гэта ўсё-такі не Амерыка, маштабы мініяцюрныя.

***— Але прафесійная праца творцы далёка не заўсёды можа быць зарукай поспеху — для гэтага яшчэ патрэбна публіка, якая здольная ацаніць творы...***

— Галандыя — краіна мастацтва. Тут яго вельмі паважаюць. Было паўночнае адраджэнне, «фламандская школа», Рэмбрант, Ван-Гог... Вы не паверыце: тут практычна ўсе вуліцы названыя імёнамі мастакоў. За рэдкім выключэннем... Пад яго падпадае мая галерэя. Мы жартуем: вось праслаўлю вуліцу, і яе назавуць маім імем!

Краіна перанасычаная мастацтвам, і галандцы ў ім разбіраюцца. У нас, кажуць, каб займацца творчай працай, трэба яшчэ рабіць салонны жывапіс ці яшчэ што, каб на хлеб зарабіць. Тут такога падзелу няма. Тут цэніцца ўласная творчасць, ты павінен быць своеасаблівым аўтарам, узмацняецца тое, што называецца індывідуальнасцю. Разменьвацца не трэба, бо яны разумеюць мастацтва, але больш любяць абстрактнае. Большасць галерэй працуе менавіта з канцэптуальным, абстрактным мастацтвам. Таму мая творчасць для іх з'явілася нечым новым. Я лічу, што ў нейкім сэнсе яны згубілі школу, як такой базы ў ВНУ не даюць пры навучанні творцаў, робяць націск на экспрэсію, а тэхніка пацярпела. Таму мае суб'ектыўнае меркаванне: магчыма, яны засумавалі па добрым, якасным мастацтве. Для мяне як для мастака гэта цудоўная глеба для далейшага росту.

***— Няўжо беларуская глеба не такая ўрадлівая?***

— У нас у Беларусі ўсе мастацкія падзеі атрымліваюцца лакальныя, няма інтэрнацыянальнага выхаду. У нас няма галерэй — ну, магчыма, адна... Ім цяжка зразумець, што так бывае... І ніводнае творчае аб'яднанне, таварыства ці галерэя не прадстаўлена на міжнародных кірмашах мастацтва. Па-першае, у нас у краіне наогул няма ЭКСПА па выяўленчым мастацтве — падобных хоць бы на міжнародныя кніжныя выставы ці камп'ютарныя, ці тэхнікі. Хоць у іншых краінах яны бываюць даволі часта — толькі па мастацтве. У Галандыі кожны месяц, а часам два разы на месяц адбываецца нейкая падзея, падобная на арт-кірмаш. У розных гарадах. Усе прэстыжныя выставы маюць у асноўным інтэрнацыянальнае прадстаўніцтва, дзе ўдзельнічаюць галерэі з розных краін. Таму развівацца тут прасцей. Мы шмат чаго не ведаем, не ведаем сучасных замежных мастакоў, ды і свае людзі не надта ведаюць. У нас нават якасных часопісаў няма па сучасным выяўленчым мастацтве, а той, што ёсць, далёкі ад узроўню замежных аналагаў.

Што ў нас добрае — дык гэта прафесійнае асяроддзе, яно дае магчымасць адбыцца асобе, прарасці зерню. А што будзе з гэтым парасткам далей — пытанне складанае. Бо для яго росту патрэбныя ўмовы: і падкормка своечасовая, і прыток свежага паветра. Атрымліваецца, што ты варышся ў адным катле, таму часам узнікае нейкая зайздрасць з боку калег, якім не так пашчасціла. Не, вядома, выстаўляюцца лепшыя беларускія мастакі ў Еўропе, Амерыцы, гэта дае ім магчымасць жыць. Але ўсё роўна нічога не адбываецца цікавага ўнутры краіны. Гэта вялікі мінус для актыўнага мастацкага працэсу. Хоць быццам бы на першы погляд усё ёсць: і школа, і творцы. Насамрэч я шчаслівая, што вучылася ў Беларусі.

***— Вы вырашылі знаёміць з нашай школай галандцаў?***

— Спачатку я вырашыла, што для вядомасці мне неабходна ўдзельнічаць у такіх праектах як вялікія інтэрнацыянальныя арт-кірмашы. У сувязі з гэтым я сутыкнулася з такім момантам, што мастак, паводле правілаў усіх мерапрыемстваў, не мае права сябе прадстаўляць, нават калі мае галерэю-студыю. Я зламала гэты стэрэатып, мне ўдалося паўдзельнічаць у трох праектах праз такую галерэю — толькі дзякуючы якасці працы. Але калі ўдзельнічаеш у такім ЭКСПА, то заўсёды добра мець дапаўненне да карцін — скульптуру, іншыя віды мастацтваў. Гэта больш цікава для гледача, можна атрымаць больш шырокае кола прыхільнікаў. Таму ўзнікла думка стварыць кола мастакоў вакол маёй галерэі — менавіта беларускіх. Калі я адчыняла галерэю, то не думала пра тое, каб зарабляць грошы на кімсьці. Я не чалавек бізнэсу, хоць дзелавыя і арганізацыйныя якасці ёсць. І ўжо з 2010 года я стала прадстаўляць у сваёй галерэі беларускую школу, якая ніяк не была тут прадстаўленая. Была адна галерэя ў маленькім горадзе, якая таксама беларускіх мастакоў выстаўляла, але не вельмі прадстаўніча і прафесійна, бо яны не ўдзельнічалі ні ў адным кірмашы. Былі асобныя выставы, арганізаваныя пасольствам Беларусі ў Галандыі. Але па вялікім рахунку беларускага мастацтва яны не бачылі. А цяпер у мяне практычна кожны месяц нейкая падзея — то ў галерэі, то якая-небудзь ЭКСПА. За адзін кірмаш 10 тысяч наведвальнікаў і больш праходзяць. Ёсць інфармацыя ў каталогах, плюс я раблю рассылку на сайты, у якіх свая аўдыторыя. Такім чынам, мая галерэя — гэта не толькі месца, але я яшчэ раблю прамоўшн сабе і людзям, з якімі супрацоўнічаю. Звычайна на мерапрыемствы з маім удзелам завітвае беларускі пасол Алена Грыцэнка — сябрую з нашым пасольствам, яны мяне падтрымліваюць, бо ўсё-такі цяпер у Галандыі ёсць выспачка беларускага мастацтва.

***— Разумею, што вы працуеце яшчэ няшмат часу, але, магчыма, ёсць канкрэтныя вынікі?***

— У чэрвені я была на выставе ў Лондане, дзе прадстаўлялася мастацтва Усходняй Еўропы, рускае, і Далёкага Усходу. Таксама мяне наведваў беларускі пасол у Вялікабрытаніі Аляксандр Міхневіч. І яшчэ была прадстаўленая англійскаму прынцу Майклу Кенту, ён сваяк каралевы. Цікава, што ён падыходзіў далёка не да ўсіх удзельнікаў, а я была адной з першых, каго яму прадставілі арганізатары. Ён быў афіцыйны ганаровы госць выставы. Мерапрыемства было шыкоўнае. Гала-вечар сабраў багему. Было шмат прэсы, тэлебачання, нават з расійскіх выданняў — расійскае мастацтва было прадстаўлена шырока. А беларускае — толькі маім стэндам.

У жніўні буду ўдзельнічаць у Бельгіі ў інтэрнацыянальнай выставе сучаснага мастацтва і антыкварыяту. Як правіла, такія выставы заўсёды высокага ўзроўню, таму што на антыкварных выставах аўтаматычна прысутнічаюць імёны: чым больш славутае імя, тым больш цікавасці да мерапрыемства.

Сёлета ў мяне ўжо было 3 кірмашы — два ў Галандыі (адна ў Ратэрдаме), у Хертэген Бошы, гэта самая старая выстава, яна таксама выстаўляе мастацтва і антыкварыят. Дык вось, на стэндах побач былі працы Марка Шагала, Рэмбрандта — уявіце, які ўзровень! На гэтую выставу дакладна не бяруць усіх, ты павінен быць запрошаны. Але мяне ўжо бачылі на іншых выставах, ведалі ўзровень маіх работ. Таксама як і нашых скульптараў — сям'і Шапо, Віктара Мінько. Мой жывапіс, графіка і літаграфіі Сашы Шапо, скульптуры Мінько — атрымліваецца шыкоўная экспазіцыя.

***— Выбралі гэтых мастакоў як сваіх сяброў?***

— Атрымалася ўдалае спалучэнне. З сям'ёй Шапо я сябравала, іх дзіця — мой хрэснік. Але як кажуць: у бізнэсе нічога асабістага. Гэта я засвоіла ў Галандыі. Так атрымалася, што мне заўсёды падабаліся Сашавы працы, яго шыкоўныя літаграфіі: графіку ён выдатную робіць. Натуральна, калі ты з людзьмі даўно знаёмы, то ўсё прасцей. Важна, што як мастака мяне ведаюць, бо ўсё-такі людзі аддаюць свае творы (столькі было гісторый з падманамі). Калі ты галерыст, то вельмі важна, каб быў асабісты кантакт, калі ты сам з гэтага асяроддзя. І яшчэ важны прафесіяналізм. Калі чалавек з густам, з адукацыяй, гэта адчуваецца ў працы. Віктара Мінько я асабіста не вельмі добра ведала. Мне яго параілі. Калі я зімой была ў Беларусі, то была ў яго ў майстэрні, мы пагаварылі, выбралі работы, і пайшло супрацоўніцтва.

***— Як змянілася ваша творчасць пасля пераезду (раней вы малявалі ўрбаністычныя пейзажы)? Магчыма, там у вас змяніўся погляд на жыццё, на людзей, на горад?***

— Так, змены ёсць. Тут вучышся шырокаму кругагляду ва ўсім, пачынаючы ад таго, як ты апрануты. Бо ўсім усё роўна. У Галандыі не прынята хваліцца грашыма. Мільянер можа ездзіць на веласіпедзе, міністры таксама. У Лондане мы бачылі шмат дарагіх машын з асабістым кіроўцам, а ў Галандыі вы наўрад ці ўбачыце асабістага кіроўцу. Тут кожны праяўляе сябе, як можа, і ніхто гэта не абмяркоўвае і не асуджае. У нас усё больш стэрэатыпна, а тут становішся іншым чалавекам. У сувязі з гэтым як мастак ты таксама мяняешся. Не думаеш, што і хто пра цябе скажа, як мы прывыклі з навучання. А ты думаеш пра тое, што хочаш сказаць, што можаш, што ўмееш. У мяне карціны сталі яшчэ больш эмацыйныя па нанясенні фарбы і слоя, больш сышлі ў абстракцыі — адбіваецца галандскі погляд на рэчы. Але тэматыку горада я працягваю.

***— Вы сябе лічыце ўжо галандскім мастаком ці беларускім?***

— З гэтым у мяне ўсё дакладна: я беларуска, і дзе б я ні жыла, заўсёды ёю буду. Нават калі ў мяне будзе галандскае грамадзянства. Таму я не мяняла сваё прозвішча. Для мяне прынцыпова — я хачу, каб усе адразу бачылі, чаго чакаць ад чалавека з такім прозвішчам. Яны прыкладна разумеюць, адкуль ты. Шмат якія галерэі абагульняюць мастацтва постсавецкіх краін. Я заўсёды падкрэсліваю, што паказваю беларускую школу, тлумачу, чым яна адрозніваецца ад галандскай. Кожнай галерэі важна мець свой твар. У маёй ён беларускі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Фестывалі

# «Дах» — гэта па-нашаму

Калі ў «чалавека зносіць дах», то прыадчыняюцца цёмныя таямніцы ягонага мозгу. Не ўсе гатовыя да таго, што іх глыбока схаваныя думкі раскрыюцца ўсім. А вось мастакі, артысты, літаратары гэтага зусім не баяцца. Ім за шчасце паказаць сябе ў суцэльным крэатыве. Даказаць сваю здольнасць эксперыментаваць. Выказаць думкі праз карціны, перформанс, тэатральныя формы, спевы ці літаратуру. А ёсць жа магчымасць усё гэта спалучыць!..

Вось дзеля падобных эксперыментаў і з'явіўся эксперыментатарскі фестываль «Дах». Яго прыдумалі ў Берліне. А да нас завезлі (з дапамогай мастака Алеся Родзіна, які ў Берліне як свой) — летась такі ажыятаж стаяў! Не столькі нават ад самога мастацтва, якое там было паказана, колькі ад магчымасці праявіць сябе. Вялізная тэрыторыя Палаца мастацтваў была запоўненая альтэрнатыўшчыкамі і эксперыментатарамі. А аматарам усяго такога, чаго не ўбачыш у звычайным рэжыме, радасць — ёсць дзе тусануцца. Напэўна, вось дзеля таго, каб зварухнуць і трошкі разварушыць звыклую плынь часу і наш традыцыйны погляд на мастацтва, гэта варта праводзіць.

Сёлета «Дах» ужо на месяцы — у Палацы мастацтваў. Ён будзе з намі цэлы месяц. Праўда, недастаткова прыйсці аднойчы, каб склалася пра яго цалкам аб'ектыўнае меркаванне, бо экспазіцыя будзе мяняцца тры разы.

Яна дасць магчымасць паразважаць пра тое, за кошт чаго існуе і рухаецца наперад культура аднаго народа, рэгіёна ці чалавецтва наогул.

У гісторыі беларускай культуры была цікавая з'ява — таварыствы філаматаў і філарэтаў, да якіх належалі, напрыклад, Адам Міцкевіч і Ян Чачот. Наш сучаснік бард Аляксей Жбанаў не належыць. Але нагадвае пра творчасць філаматаў і філарэтаў, стварыўшы песні на іх вершы. Увага: яны прагучалі па-беларуску! Адметна тое, што гэты праект можа жыць абсалютна самастойным жыццём пасля «Даху».

У прынцыпе як і абсалютна самадастатковая творчасць беларускіх літаратараў, якія пакажуць сябе адразу ў некалькіх праектах. Аднак гэта сапраўды добры выпадак даведацца пра беларускі дэкаданс з праекта «Кабарэ Матыльды Штор» (19 ліпеня), што аб'ядноўвае Веру Бурлак, Віктара Жыбуля і Максіма Іўкіна, якія збіраюцца выконваць... куплеты і прыпеўкі. Ды як жа ў сувязі з гульнямі розуму не ўзгадаць пра Дастаеўскага? А выдавецтва «Галіяфы» рыхтуе літаратурную вечарыну (21 ліпеня) з удзелам беларускіх аўтараў, чыя творчасць наводзіць на разважанні, а месцамі выводзіць у паралельную прастору.

За праграмай фэсту варта сачыць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ВЕДЫ І ВЕРА

## У Мінску па ініцыятыве бацькоў ствараецца яшчэ адзін праваслаўны клас

**У СТАЛІЧНАЙ школе №181 (м-н Паўднёвы Захад) набіраецца першы клас, у якім адначасова са звычайнай школьнай праграмай будзе выкладацца факультатыў «Асновы праваслаўнай культуры». Падобныя класы шмат гадоў працуюць на базе Дома Міласэрнасці ў Мінску, а таксама ў некаторых іншых школах сталіцы і рэгіёнаў. Аднак бацькі гэтага класа лічаць, што іх выпадак асаблівы. Хоць бы таму, што большасць з іх вадзілі сваіх дзетак у праваслаўную групу ў дзіцячым садку і настолькі з'ядналіся, што адчуюць сябе сапраўдным калектывам, які здольны вырашаць многія праблемы.**

— Стварэнне такога класа — ініцыятыва бацькоў, — расказала «Звяздзе» мама будучай першакласніцы Анастасіі Фаіна Мысліцкая. — Так склалася, што тры гады таму ў адну групу аддалі дзетак маладыя і творчыя людзі, якія атаясамліваюць сябе з праваслаўем. Гэта журналісты, выдаўцы, мастакі... Сама я дачку ў садок не вадзіла, бо была магчымасць пасядзець дома — у мяне яшчэ трое меншых за яе дзетак. Аднак я шмат добрага чула пра праваслаўную групу ў садку № 94, што па вуліцы Рафіева, і вырашыла для сябе, што хацела б аддаць сваё дзіця ў падобную. Галоўная асаблівасць — у атмасферы любові і дабрыні, якая там пануе. Не менш важна і тое, што з дзеткамі працавала вопытны і прафесійны педагог, прычым настаўніца пачатковых класаў. Яна пагадзілася навучаць дзяцей і ў пачатковай школе.

На сённяшні дзень у клас набрана 16 дзетак, з іх дзесяць добра ведаюць адзін аднаго, як і іх бацькі. Пакуль гэтай колькасці недастаткова, каб атрымаць дазвол на адкрыццё класа, але бацькоўскі камітэт не сумняваецца, што да 26 ліпеня — апошняй даты падачы дакументаў — патрэбная колькасць дзяцей набярэцца.



— На жаль, многія не разумеюць, што наш клас будзе самы звычайны з пункта погляду адукацыйнага працэсу, але выхаванне ў ім будзе весціся паводле прынцыпаў праваслаўя, — расказала старшыня бацькоўскага камітэту Кацярына Шэвалёва. — Некаторыя лічаць, што інтэлектуальная складовая больш важная, чым духоўная, і баяцца, што ў праваслаўным класе малітва будзе на першым месцы, а падручнік — на другім. Гэта памылка. Па-першае, нашых дзетак будзе вучыць вельмі дасведчаная і добрая настаўніца, якую мы ведаем і якой давяраем. Па-другое, мы ўпэўненыя, што без высокай маралі веды не прынясуць карысці ні асобнаму чалавеку, ні краіне. Паглядзіце наўкол і ўпэўніцеся, што добра выхаванае дзіця лепш вучыцца і за яго будучыню не так трывожна. Што тычыцца малітвы, то яна, напэўна, будзе прысутнічаць, але роўна столькі, колькі і павінна займаць у жыцці 7-10-гадовага дзіцяці. Перад вучэннем, перад і пасля трапезы. Прычым плануецца, што дзеці будуць маліцца ў класе, каб не бянтэжыць іншых школьнікаў і не вылучаць сябе.

Клас з выкладаннем факультатыву «Асновы праваслаўнай культуры» фарміруецца на падставе пагаднення паміж Беларускай праваслаўнай царквой і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пакуль існуе зацверджаная міністэрствам праграма факультатыўнага курса «Асновы праваслаўнай культуры» толькі для пачатковай школы і старшакласнікаў. Аднак бацькі будучага праваслаўнага класа не сумняваюцца, што яны здолеюць працягнуць выхаванне і адукацыю сваіх дзяцей у праваслаўным духу і ў сярэднім звяне школы.

— Мы працуем над гэтым, — запэўніла адна з маці.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**СОАО «МИНСК-ЛАДА»**

*(220024, г. Минск, ул. Серова, д. 1)*

**18 августа 2010 года в 10.00 проводит внеочередное общее собрание акционеров**

**Повестка дня:**

1. Определение порядка ведения внеочередного общего собрания акционеров.
2. Досрочное прекращение полномочий членов совета директоров СОАО «Минск-Лада».
3. Определение количественного состава совета директоров СОАО «Минск-Лада».
4. Избрание совета директоров СОАО «Минск-Лада».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — **09.07.2010 г.**

Собрание состоится в СОАО «Минск-Лада» по адресу: **г. Минск, ул. Серова, д. 1.** Регистрация акционеров **18.08.2010 г. с 09.00 до 10.00.** При себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность). С информацией, необходимой для проведения собрания, можно ознакомиться: понедельник—пятница с 9.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Серова, д. 1, ком. 301.

УНП 100003417.

**ВНИМАНИЮ ВЛАДЕЛЬЦЕВ АКЦИЙ ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД ОТОПИТЕЛЬНОГО ОБОРУДОВАНИЯ»**

**Акционерное общество информирует владельцев акций общества о том, что выплата дивидендов за 2009 год началась с 15 июля 2010 года во Фрунзенском отделении ОАО «БПС-Банка» по адресам:**

220073, г. Минск, ул. Тимирязева, 29, РКЦ (т. 2043069)
220073, г. Минск, ул. Гусовского, 6 (т. 2524527)
220015, г. Минск, ул. Я. Мавра, 47 (т. 2523949)
220004, г. Минск, ул. Кальварийская, 4а (т. 2972187)

**Справки по телефону 2032838.**

УНП 100008064. **Наблюдательный совет.**

В публикации извещения о проведении открытого аукциона по продаже объектов госсобственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, организатор которого Минский городской территориальный фонд государственного имущества (газета «Звязда» № 137 от 16.07.2010 г. 7-я полоса): **Лот № 3 графа «Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета» вместо цифр 83 793 800**

**СЛЕДУЕТ ЧИТАТЬ 32 175 400.**

# МАДОНА ЯК МУЗА

## ПРЫГАЖОСЦЬ ПРЫВЯЛА МАСТАКА АЛЯКСЕЯ КУЗЬМІЧА ДА ДУМАК ПРА РАДЗІМУ

**Пазнаёміцца з імі можна на выставе яго жывапісу ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. І зразумець, чаму папулярны беларускі аўтар стаў акадэмікам Міжнароднай Кірыла-Мяфодзеўскай акадэміі славянскай асветы.**

Аляксей Кузьміч любіў маляваць жанчын. Прыгожых. Праўда, трэба прызнаць, што ў многіх творах угадваўся вобраз адной... Якую ён сам узвялічыў да Мадоны. Кажуць, у майстэрні мастака больш за 700 палотнаў, якія паказваюць Мадону ў розных іпастасях. Жанчына-прыгажуня, жанчына-маці натхняла Кузьміча ў творчасці не адно дзесяцігоддзе. І натхняе цяпер. Мала таго, усведамленне гэтага вобразу пашырылася і прывяло мастака да больш высокіх абагульненняў: шляху, які праходзіць у свеце чалавек ці народ. І вось з'яўляецца ў яго творчасці вобраз радзімы-маці. Надзіва, але ён аказваецца блізкі да ўспрымання славянскіх народаў. І вось тут трэба паглыбіцца ў гісторыю, каб скласці сваё стаўленне да творчасці апявальніка Мадонаў. Бо для акадэміка такой акадэміі існуе паняцце гістарычнай Русі, якое нельга, на яго думку, аддзяліць ад Белай Русі. А далей — трэба глядзець творы, з якіх цэлы цыкл прысвечаны менавіта тэме еднасці.

Вось паглядзіш і падумаеш пра ўзаемазалежнасць адчування тэмы і поспеху, які за гэтым прыходзіць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ**

| | |
|---|---|
| Полное наименование и местонахождение покупателя акций | открытое акционерное общество «Приднепровье» Республика Беларусь, 247485, Гомельская обл., г. Речица, ул. Строителей, 2а, тел. 8-02340-36160, 36351 |
| Полное наименование и местонахождение эмитента, акции которого приобретаются | открытое акционерное общество «Приднепровье», 247485, Гомельская обл., г. Речица, ул. Строителей, 2а |
| Цель приобретения акций | для продажи инвестору на условиях, предусмотренных бизнес-планом и аннулирования |
| Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель | 6 512 акций – для продажи инвестору на условиях, предусмотренных бизнес-планом, и 773 акции – с целью аннулирования, в том числе с использованием преимущественного права Общества в соответствии с законодательством Республики Беларусь |
| Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции | 28 693 (двадцать восемь тысяч шестьсот девяносто три) белорусских рубля. При наличии заявок на продажу на фондовой бирже либо получения Обществом извещения акционера о намерении продать принадлежащие ему акции по цене продажи выше предложенной, делегировать полномочия для принятия решения о согласии с предлагаемой акционером ценой приобретения акции наблюдательному совету Общества. Срок принятия решения – не более пяти дней со дня получения извещения акционера о намерении продать принадлежащие ему акции |
| Форма, порядок и срок оплаты акций | денежными средствами путем безналичного перечисления на расчетный счет продавца в срок до 24 августа 2010 года |
| Адрес, по которому будет совершаться покупка акций (заключаться договора купли-продажи) | открытое акционерное общество «Приднепровье», Республика Беларусь, 247485, Гомельская обл., г. Речица, ул. Строителей, 2а |
| Дата начала срока представления предложений акционеров на продажу акций | 18 июля 2010 г. |
| Дата окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций | 22 июля 2010 г. |
| Дата начала покупки акций (заключения договоров купли-продажи) | 23 июля 2010 г. |
| Дата окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи) | 24 августа 2010 г. |

Минский городской центр недвижимости

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 30 ИЮЛЯ 2010 ГОДА 101-ГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений коммунальной собственности г. Минска

| № лота | Наименование объекта недвижимости, его адрес, описание, условия аукциона | Арендуемая площадь, кв. м | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска», тел. 285-56-02** | | |
| 1 | Ул. Голодеда, 75, пом. 7, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, общий вход с другими арендаторами. Под административное использование (офис), склад. | 29,8 | 600 |
| 2 | Ул. Я. Райниса, 17, пом.1 на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел, отдельный вход. Под административное использование (офис), склад. | 139,5 | 2 500 |
| | **КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска», тел. 223-35-03** | | |
| 3 | Ул. Прушинских, 58, помещение на первом этаже, водоснабжение, санузел, отдельный вход, отсутствует отопление, естественное освещение. Под размещение торгового объекта продовольственной, непродовольственной группы товаров. | 23,9 | 2 000 |
| 4 | Ул. Первомайская, 2, мансарда, вход через подъезд жилого дома, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования. Под творческую мастерскую или административное использование (офис). | 65,5 | 2 000 |
| 5 | Ул. К. Маркса, 8, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отдельный вход, отсутствует водоснабжение и санузел. Победителю аукциона необходимо выполнить восстановление входной группы, согласно техническому паспорту за счет собственных средств без последующей компенсации. Под административное использование (офис). | 12,3 | 250 |
| 6 | Ул. Красноармейская, 8, помещение на первом этаже, имеется отдельный вход, отсутствует естественное освещение, канализация. Победителю аукциона необходимо выполнить требования МЧС и санэпидемстанции. Требуется реконструкция объекта с изменением функционального назначения за счет средств арендатора без последующей компенсации выполненных работ. Под торговый объект продовольственной группы товаров | 15,0 | 300 |
| 7 | Ул. Физкультурная, 26а, помещение на втором этаже, санузел совместного пользования, вход совместно с другими арендаторами. Под административное использование (офис). | 36,3 | 650 |
| | **КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска», тел. 252-80-63** | | |
| 8 | Ул. Есенина, 3, корп.1, помещение на первом этаже жилого дома. Имеется отопление, водоснабжение, энергоснабжение, канализация. Под административное использование (офис), творческую мастерскую, туристические и риэлтерские услуги | 58,9 | 1 100 |
| | **КУП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска», тел. 213-29-60** | | |
| 9 | Ул. Казинца, 122, помещения первого этажа в жилом доме, санузел совместного пользования с другими арендаторами. Под объект общественного питания. | 199,0 | 4 000 |
| 10 | Ул. Рабкоровская, 2, помещение на третьем этаже отдельно стоящего здания. Под административное использование (офис). | 27,1 | 500 |
| | **КУП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска», тел. 294-01-11** | | |
